Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Зараз самы час завяршаць назапашаныя справы, падводзіць вынікі і аддаваць даўгі. Дарэчы, нядрэнна было б узяць адпачынак. Тым жа, у каго наперадзе звычайны працоўны тыдзень, важна захоўваць душэўную раўнавагу, бо магчымыя канфлікты з калегамі і дадатковыя патрабаванні ад начальства. У канцы тыдня старайцеся не прымаць паспешлівых рашэнняў, паспрабуйце перш усё як след абдумаць.

ЦЯЛЕЦ. З'явіцца шанц нагнаць упушчаныя магчымасці ў той сферы, якая для вас найбольш важная. А што гэта — работа або асабістае жыццё — вырашайце самі. Зможаце прааналізаваць, як і па якіх сцэнарыях разгортваюцца адносіны з людзьмі. І адчуеце, з якіх элементаў часу складаецца ваша жыццё. Паспрабуйце не паддавацца на эмацыянальныя правакацыі і не ўвязвацца ў спрэчкі. У нядзелю будзе дарэчы пасіўны адпачынак, дазвольце сабе як след выспацца.

БЛІЗНЯТЫ. Паспяховы тыдзень. Вас чакаюць любоўныя прызнанні і рамантыка. Але для дасягнення важных мэт не дазваляйце сабе расслабляцца. Панядзелак закруціць у віры прыемных падзей. У аўторак зможаце ўвайсці ў зайздросны працоўны рытм. Вашай кіпучай дзейнасці не зможа перашкодзіць нішто. Будзьце ўпэўненыя ў сабе і часцей усміхайцеся.

РАК. Неабходна ўмацоўваць свой аўтарытэт і берагчы рэпутацыю. Старайцеся менш гаварыць і больш слухаць. Не спрабуйце нікому навязваць сваё меркаванне, гэтым вы толькі адштурхняце ад сябе аднадумцаў. У пачатку тыдня вашы смелыя распрацоўкі і новыя ідэі будуць адзначаны начальствам, і, як вынік, можна чакаць павышэння па службе. У чацвер неабходна разабрацца з незавершанымі папяровымі справамі. У нядзелю давядзецца заняцца праблемамі падрастаючага пакалення.

ЛЕЎ. Прычынамі няўдач могуць стаць залішняя даверлівасць і нежаданне прааналізаваць сітуацыю. Вы занадта доўга добра сябе паводзілі, час даць выхад унутранаму напружанню, але зрабіць гэта трэба так, каб ніхто з навакольных не пацярпеў. У сераду верагодныя новыя творчыя кантакты і цікавыя прафесійныя прапановы. Не зашкодзіць павышаная ўвага да спраў родных у выхадныя дні.

ДЗЕВА. Поспех будзе залежаць ад упэўненасці ў правільнасці свайго выбару і зладжанасці дзеянняў. У панядзелак будзьце гатовыя дзейнічаць па абставінах. У аўторак усё рабіце самі, а калі не можаце — строга кантралюйце дзейнасць памочнікаў. У гэты дзень магчымыя падманы і скажэнне інфармацыі, паспрабуйце гэтага пазбегнуць. У пятніцу пакіньце ўбаку службовую стараннасць, яна не дасць станоўчых вынікаў. Больш вольнага часу прысвячайце сям'і і дзецям.

ШАЛІ. У пачатку тыдня на вас можа зваліцца шмат клопатаў і дробных, але з'едлівых праблем. Чым больш бескарыслівай падтрымкі вы аказваеце людзям, якія жывуць у нястачы, тым больш пазітыўнымі будуць змены ў жыцці. Пачынаючы з серады, варта прытрымлівацца раскладу і не спазняцца. Да дасягнення жаданага выніку застанецца зусім няшмат, таму не раскідвайцеся і займайцеся самымі неадкладнымі справамі. Субота — цудоўны дзень для самаадукацыі ў любой вобласці.

СКАРПІЁН. Захоўвайце спакой і ўпэўненасць ва ўласных сілах. Прафесійныя і фінансавыя справы палепшацца дзякуючы вашай настойлівасці і самааддачы. З'явіцца жаданне змяніць не толькі свой імідж, але і ўнутраны стан. Вас відавочна натхняе блізкі чалавек. Вашы любоўныя пачуцці ўзаемныя. Ініцыятывы аўторка ўвянчаюцца поспехам, калі ўдасца ўтаймаваць нервовасць і не працаваць звыш меры. У суботу, перш чым нешта вырашаць або прадпрымаць, праявіце стрыманасць і разважлівасць.

СТРАЛЕЦ. У гэтыя дні разлічвайце толькі на свае сілы, бо дапамога іншых можа аказаць вам «мядзведжую паслугу», наступствы якой потым будзе цяжка выправіць. Затое зможаце праявіць сябе. У чацвер парадуюць пазітыўныя падзеі і цікавыя сустрэчы. Субота падыходзіць для гутарак з сябрамі і сямейных застолляў. Нядзелю лепш прысвяціць адпачынку ў адзіноце.

КАЗЯРОГ. Калі зберацеся, то будзеце здольныя здзейсніць скачок у кар'еры. У панядзелак верагодныя адказныя перамовы і здабыццё новых дзелавых партнёраў. Вы справядліва мяркуеце, што вартыя большага. Але не бярыце павышаныя абавязацельствы, пры цяперашнім тэмпе працы, вам складана будзе іх выканаць.

ВАДАЛІЎ. Неабходна прыслухацца да голасу розуму, а не ісці на повадзе ў сваіх жаданняў і запалу. У пачатку тыдня будзеце шмат кантактаваць і знаёміцца з новымі людзьмі. Паспрабуйце зрабіць прыемнае ўражанне з першых слоў. Каб у чацвер таемныя нядобразычліўцы не засталі вас знянацку, мабілізуйце свой розум і сілы ды падрыхтуйцеся супрацьстаяць іх атакам. У канцы тыдня адчуеце павышэнне жыццёвага тонусу, а невялікія замінкі ў справах застануцца ў мінулым.

РЫБЫ. На гэтым тыдні плюсоў і мінусаў у прафесійных і асабістых справах будзе пароўну, аднак у цэлым тыдзень спрыяльны, асабліва для творчых пачынанняў. Настрой і працаздольнасць будуць на вышыні, калі вы вызначыце для сябе пэўныя мэты і зловіце кураж. У асабістай сферы не выключаны авантурныя матывы, якія неўзабаве могуць ператварыцца ў цэлую мелодыю, пад якую вам давядзецца скакаць. Аднак, калі паспрабуеце ўтаймаваць сваю ўпартасць, то цалкам зможаце захаваць у сям'і мір і спакой.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.08	19.26	12.18
Віцебск —	6.58	19.16	12.18
Магілёў —	6.58	19.16	12.18
Гомель —	6.55	19.12	12.17
Гродна —	7.24	19.41	12.17
Брэст —	7.25	19.42	12.17

Месяц

Поўня 21 сакавіка.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Наталлі, Валерыя, Дзмітрыя, Івана, Ілы, Мікалая, Пятра, Рыгора, Сяргея, Тараса.*
К. *Катарыны, Багуслава, Захарыя, Паўла, Казіміра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

22 САКАВІКА

1809 год — нарадзіўся (г. Слуцк) Кандрат Ільіч Карсалін, мастак, акадэмік Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Ужо з 14 гадоў стаў працаваць памочнікам іканапісцаў. Першыя ўрокі партрэтнага майстэрства атрымаў пад кіраўніцтвам Т. Геса — выкладчыка Слуцкай гімназіі. З 1838 года — вольны слухач Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, дзе ў 1839-м атрымаў званне пазакласнага мастака. Да 1843 года знаходзіўся ў складзе Рускай духоўнай місіі ў Пекіне. Там ён шмат працаваў у жанры партрэта, першым з беларусаў маляваў Пекін. Памёр у 1884 годзе.

1943 год — фашысцкія карнікі спалілі беларускую вёску Хатынь і яе жыхароў. Загінула 149 чалавек, у тым ліку 75 дзяцей. У жывых засталіся толькі пяцёра дзяцей і адзін дарослы — Іосіф Камінскі. У 1969 годзе на месцы вёскі ўзведзены мемарыяльны комплекс у памяць пра ахвяр фашызму ў Беларусі.

1944 год — адбыўся бой партызанскіх брыгад імя Жукава і «Камсамолец» па разгроме нямецка-фашысцкага гарнізона ў г. п. Мір, які ўвайшоў у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны пад назвай Мірскі бой. План знішчэння гарнізона (150 гітлераўцаў) распрацаваны камандаваннем брыгады імя Жукава, агульнае кіраўніцтва аперацыяй ажыццяўляў камандзір Стаўбцоўскага партызанскага злучэння У. З. Царук. Ведаючы пароль аховы гарнізона, партызаны ў ноч на 22 сакавіка бесперашкодна пранікілі ў цэнтр пасёлка, блакіравалі казарму, разграмілі ўсе ўстановы акупантаў. У выніку бою знішчана 12 гітлераўцаў, захоплена некалькі аўтамашын, шмат прадуктаў харчавання і медыкаментаў.

1991 год — створаны Нацыянальны алімпійскі камітэт Беларусі.

1995 год — Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь устанавіў найвышэйшае званне «Герой Беларусі».

1915 год — нарадзіўся Георгій Сцяпанавіч Жжонаў, савецкі і расійскі акцёр, народны артыст СССР. У 1939—1946-м і 1947—1954-м рэпрэсаваны, двойчы рэабілітаваны. Працаваў у тэатрах Магадана і Нарыльска, з 1969 года — у Дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Массавета. Здымаўся ў кінастужках «Чалавек, якога я люблю», «Уся каралеўская раць», «Гарачы снег», «Экіпаж» і іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расіі. Памёр у 2005 годзе.

1925 год — у мэтах умацавання аўтарытэту камандзіра і ўзняцця баявой гатоўнасці быў выдадзены загад РВС СССР «Аб увядзенні адзінаначалля ў Чырвонай Арміі». Гэты крок стаў адным з важных элементаў ваеннай рэформы 1924—1925 гадоў.



1949 год — нарадзілася Фані Ардан, французская актрыса тэатра і кіно. Здымалася ў фільмах «Жыццё — гэта раман», «Каханне да смерці», «Меладрама» і многіх іншых.

УСМІХНЕМСЯ

Адэскі аўтасэрвіс:

— Мадам, вы ж такі гадзіну таму тэлефанавалі, што ў вас толькі бампер пабіты. А я гляджу, тут і капот, і дзверы, і шкло выбіта, і фары разбітыя...

— І што? Я ж ехала! Пакуль даехала.

У свой час Наталля захаплялася ёгай, медытацыяй і самагіпнозам... І нарэшце прыйшла да высновы, што каньяк ні кроплі не горшы!

— Вам больш падабаюцца віно ці жанчыны?

— Гледзячы які год.

Што прыгатаваць, калі ў халадзільніку толькі жалезныя рашоткі і маянэз?

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 929.
Нумар падпісаны ў 19.30 21 сакавіка 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12